# *§ 45–0. Краіны Цэнтральнай і Паўднёва-Усходняй Еўропы

**САВЕЦКАЯ МАДЭЛЬ САЦЫЯЛІЗМУ**
**НАЦЫЯНАЛІЗАЦЫЯ**
**ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫЯ**
**КАЛЕКТЫВІЗАЦЫЯ АДНАПАРТЫЙНАСЦЬ**
**«АКСАМІТНЫЯ РЭВАЛЮЦЫІ»**
**ШМАТПАРТЫЙНАСЦЬ**
**РЫНАЧНАЯ ЭКАНОМІКА**
**«ШОКАВАЯ ТЭРАПІЯ»**

**1. Асноўныя этапы развіцця.** Пасля Другой сусветнай вайны ў гісторыі краін Цэнтральнай і Паўднёва-Усходняй Еўропы (ЦПУЕ) можна вылучыць некалькі этапаў.

1945 г. — 1947 г. — Сярэдзіна 1970-х гг. — Пачатак 1990-х гг. — Першая чвэрць XXI в.

**1945–1947 гг.**
Правядзенне дэмакратычных пераўтварэнняў пры захаванні палітычнага плюралізму (за выключэннем Югаславіі і Албаніі)

**Канец 1940-х — сярэдзіна 1970-х гг.**
Час будаўніцтва ў краінах ЦПУЕ савецкай мадэлі сацыялізму. Характэрныя як грамадскія крызісы ў шэрагу краін, так і пэўныя дасягненні ў развіцці эканомікі і сацыяльнай сферы

**Сярэдзіна 1970-х — пачатак 1990-х гг.**
Нарастанне крызісных з’яў у розных сферах грамадскага жыцця сацыялістычных краін, перш за ўсё ў эканоміцы

**Пачатак 1990-х — першая чвэрць XXI ст.**
Пераход краін ЦПУЕ да рынначай эканомікі і парламенцкай дэмакратыі, інтэграцыя ў Заходні свет

**2. Агульнадэмакратычны характар пераўтварэнняў 1945–1947 гг.** На фінальным этапе Другой сусветнай вайны ў краінах ЦПУЕ ўтварыліся шырокія кааліцыі палітычных сіл (нацыянальныя франты),

**Першыя пасляваенныя ўрады**

якія выступалі за агульнадэмакратычныя пераўтварэнні. Першыя пасляваенныя ўрады былі кааліцыйныя, уключалі прадстаўнікоў розных партый. Вялікі ўплыў на палітычную сітуацыю ў краінах рэгіёна аказвала прысутнасць на іх тэрыторыі савецкіх войскаў. Іх падтрымка спрыяла росту ўплыву камуністычных партый. Тым не менш на выбарах, што праходзілі ў краінах ЦПУЕ ў першыя пасляваенныя гады на шматпартыйнай аснове, кампартыі атрымлівалі $^1/_4$–$^1/_3$ галасоў. Сітуацыя ў Югаславіі і Албаніі вылучалася тым, што гэтыя краіны былі вызваленыя з-пад фашысцкай акупацыі ўзброенымі сіламі, якія стварылі мясцовыя камуністычныя партыі. У выніку ўся паўната ўлады ў іх адразу ж апынулася ў руках камуністаў. Важным палітычным пераўтварэннем была ліквідацыя манархій у Румыніі, Балгарыі, Югаславіі.

Успомніце, якія дзяржавы ЦПУЕ былі вызваленыя войскамі Чырвонай Арміі.

**Эканамічныя пераўтварэнні**

На момант заканчэння Другой сусветнай вайны краіны ЦПУЕ заставаліся аграрнымі (за выключэннем Усходняй Германіі і чэшскіх зямель Чэхаславакіі). Таму важна было правесці пераўтварэнні, якія паскорылі б пераход да індустрыяльнага грамадства. Найважнейшай у гэтым плане стала аграрная рэформа, у выніку якой было ліквідавана памешчыцкае землеўладанне, зямля перайшла ў рукі сялян. Пачалася нацыяналізацыя. Аднак пакуль яна мела абмежаваны характар і закранала, як правіла, маёмасць тых, хто быў звязаны з нацысцкай (Усходняя Германія) і прафашысцкімі дыктатурамі (Венгрыя, Румынія) або супрацоўнічаў з акупантамі.

Чаму ў краінах ЦПУЕ нацыяналізацыя насіла абмежаваны характар?

**Пачатак пабудовы савецкай мадэлі сацыялізму**

**3. Будаўніцтва сацыялізму: дасягненні і праблемы.** Ад восені 1947 г. краіны ЦПУЕ пераходзяць ад агульнадэмакратычных пераўтварэнняў да будаўніцтва савецкай мадэлі сацыялізму. Уся паўната ўлады канцэнтруецца ў руках камуністычных партый, усталёўваюцца аднапартыйныя дыктатуры. У некаторых краінах (ГДР, Польшча) захавалася фармальная

шматпартыйнасць, але іншыя партыі не маглі скласці рэальнай канкурэнцыі камуністам у барацьбе за ўладу. Марксісцка-ленінская ідэалогія насаджалася як адзіная для ўсяго грамадства. У эканоміцы дзяржаўны сектар заняў пануючыя пазіцыі. Але ў адрозненне ад СССР захаваліся прыватныя дробныя прадпрыемствы. Не насіла ўсеагульны характар кааперацыя сельскай гаспадаркі, а ў Польшчы большасць сялян не была ахопленая кааперацыяй і вяла прыватную гаспадарку. Найважнейшым элементам пабудовы сацыялізму стала індустрыялізацыя. Яна праводзілася на ўзор СССР: паскоранымі тэмпамі з развіццём у першую чаргу цяжкай прамысловасці.

### Крызісныя з'явы

Да сярэдзіны 1950-х гг. краіны ЦПУЕ дасягнулі пэўных поспехаў у развіцці прамысловасці. Аднак паскораная індустрыялізацыя прывяла да ўтварэння дыспрапорцый у эканоміцы. Будаўніцтва заводаў-гігантаў, што патрабавала велізарных капіталаўкладанняў, у невялікіх краінах было эканамічна нерацыянальнае. Не хапала сродкаў на сельскую

## ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

Падзеі 1956 г. з'яўляюцца адными з самых трагічных падзей венгерскай гісторыі XX ст. і дагэуль ацэньваюцца супярэчліва. У выніку масавых акцый пратэсту ў кастрычніку ў краіне быў сфарміраваны ўрад на чале з І. Надзем. Гэты ўрад абвясціў выхад Венгрыі з Арганізацыі Варшаўскай Дамовы (АВД). Толькі пры актыўным удзеле савецкіх войскаў пратэсны рух удалося здушыць і ўтрымаць Венгрыю ў сацыялістычным «лагеры».



*1. Пры дапамозе дадатковых крыніц даведайцеся, якую назву атрымалі гэтыя падзеі.*
*2. Чым скончыліся падзеі 1956 г.? Як гэтыя падзеі паўплывалі на СССР і АВД?*
*3. Дайце сваю ацэнку гэтым падзеям.*

гаспадарку, марудна развівалася лёгкая прамысловасць. Яны аказаліся не здольныя задаволіць пакупны попыт насельніцтва. У выніку ўжо ў сярэдзіне 1950-х гг. сацыялістычныя краіны сутыкнуліся з першымі значнымі крызісамі. Масавыя выступленні рабочых адбыліся ў ГДР (1953 г.). Да забастовак і ўзброеных выступленняў дайшло ў Польшчы (1956 г.). Найбольш драматычна падзеі развіваліся ў Венгрыі.

### Укараненне рынкавых элементаў у эканоміку

Для пераадолення недахопаў мадэлі «рэальнага сацыялізму» ў шэрагу краін ЦПУЕ ў 1960-я гг. ладзяцца эканамічныя рэформы. Былі зробленыя спробы ўвесці асобныя элементы рынкавых адносін. Пашыралася эканамічная самастойнасць прадпрыемстваў, рабіліся захады, каб павысіць зацікаўленасць работнікаў у выніках працы. Але рэформы не закранулі манаполію камуністычных партый на палітычную ўладу. Толькі ў Чэхаславакіі кіраўніцтва кампартыі на чале з А. Дубчэкам у 1968 г. пайшло на дэмакратызацыю палітычнага жыцця. Быў высунуты лозунг пабудовы «сацыялізму з чалавечым абліччам». Аднак палітыка рэформаў, што атрымала назву «пражская вясна», была спынена пасля ўводу ў Чэхаславакію войскаў краін АВД. Пасля гэтага па-

Параўнайце падзеі 1956 г. у Венгрыі і 1968 г. у Чэхаславакіі. Вылучыце агульнае і адрознае паміж гэтымі падзеямі.



*Падзеі «Пражскай вясны» 1968 г.*

чалося згортванне эканамічных рэформаў у краінах сацыялізму.

**Сацыяльна-эканамічнае развіццё ў 1970–1980-х гг.**

Напачатку 1970-х гг. краіны ЦПУЕ стварылі значны эканамічны патэнцыял, аснову якога складалі буйныя прадпрыемствы. На сацыялістычныя краіны прыпадала $^1/_3$ прамысловай вытворчасці ў свеце. Быў вырашаны шэраг сацыяльных праблем: ліквідаванае беспрацоўе, эфектыўна працавалі сістэмы сацыяльнага забеспячэння, аховы здароўя, развіваліся адукацыя і навука, хоць і павольна, але рос жыццёвы ўзровень насельніцтва.

Ад сярэдзіны 1970-х гг. у сацыяльна-эканамічнай сферы краін ЦПУЕ пачалі нарастаць цяжкасці. Яны не здолелі эфектыўна выкарыстаць дасягненні НТР для развіцця сваёй эканомікі. Тэмпы эканамічнага росту запаволіліся. Сацыялістычныя краіны ўсё больш адставалі паводле ўзроўню развіцця эканомікі ад краін Захаду. У выніку праблем у эканоміцы перастаў расці ўзровень жыцця насельніцтва. Узмацнялася незадаволенасць людзей існуючым становішчам. Прыкладам яе выяўлення выступілі масавыя забастоўкі ў Польшчы, якія пачаліся ў 1980 г.

**Прычыны «аксамітных рэвалюцый»**

**4. «Аксамітныя рэвалюцыі» і іх вынікі.** У 1989–1990 гг.у сацыялістычных краінах Еўропы адбыліся рэвалюцыйныя змены, што прывялі да іх разрыву з сацыялістычным шляхам развіцця. Прычынамі іх выступілі складаная эканамічная сітуацыя, расчараванне людзей у сацыялізме і палітыцы рэжымаў, заснаваных на аднапартыйнай дыктатуры і кульце асобы кіраўнікоў. Перабудова ў СССР таксама спрыяла наспяванню рэвалюцый, бо знікла пагроза савецкай інтэрвенцыі ў сацыялістычныя краіны. Рост агульнага ўзроўню культуры і адукаванасці, павышэнне цікавасці да заходняга ладу жыцця выклікалі крытычнае стаўленне да сацыялістычнай мадэлі развіцця сярод значнай часткі насельніцтва сацыялістычных краін, асабліва моладзі і інэлігенцыі.

## ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ




«Восень народаў» — чарада дэмакратычных рэвалюцый, што адбыліся ў 1989 г. у краінах Цэнтральнай і Усходняй Еўропы. У выніку рэвалюцый у гэтых краінах былі зрынутыя сацыялістычныя рэжымы і да ўлады прыйшлі дэмакратычныя ўрады. Шырока вядомая ўмоўная формула працягласці рэвалюцыйных падзей, якую сфармуляваў англійскі палітолаг Цімаці Гартан-Эш: «У Польшчы яна заняла дзесяць гадоў, у Венгрыі — дзесяць месяцаў, ва Усходняй Германіі — дзесяць тыдняў, у Чэхаславакіі — дзесяць дзён, а ў Румыніі — дзесяць гадзін».

1. *Прааналізуйце ход рэвалюцыйных падзей у Польшчы, Венгрыі, ГДР, Чэхаславакіі і Румыніі. Вызначыце іх працягласць.*
2. *Чаму гэтыя рэвалюцыі называюць «аксамітнымі»? Ці можам мы сцвярджаць, што рэвалюцыя ў Румыніі таксама з’яўляецца «аксамітнай»?*
3. *Дакажыце або абвергніце формулу Цімаці Гартан-Эша.*

Кіроўныя рэжымы ў большасці сацыялістычных краін былі зрынутыя мірным шляхам, таму гэтыя падзеі атрымалі назву «аксамітных рэвалюцый». Толькі ў Румыніі дыктатура Н. Чаўшэску пала ў выніку ўзброенай барацьбы са шматлікімі ахвярамі.

### Дэмакратычныя пераўтварэнні

У 1989–1990 гг. ва ўсіх краінах ЦПУЕ былі праведзеныя выбары на шматпартыйнай аснове. Яны прынеслі перамогу арганізацыям, якія стаялі на нацыянал-патрыятычнай і дэмакратычнай платформе, такім як Грамадзянскі форум у Чэхаславакіі, Венгерскі дэмакратычны форум, Саюз дэмакратычных сіл у Балгарыі. У Польшчы ролю такой арганізацыі адыграла прафсаюзнае аб’яднанне «Салідарнасць», створанае ў 1980 г. Рэвалюцыі прывялі да распаду сацыялістычнай сістэмы, аднаўлення капіталізму ў рэгіёне ЦПУЕ і змянення расстаноўкі сіл у сусветным маштабе.

**5. Фарміраванне новых палітычных і сацыяльна-эканамічных сістэм.** Новыя ўрады ўзялі курс на стварэнне шматпартыйнага дэмакратычнага грамадства і рыначнай эканомікі. Ва ўсіх былых краінах сацыялізму пачалася радыкальная ломка эканамічнага механізму, што існаваў раней: прыватызацыя, дэмантаж ранейшай сістэмы дзяржаўнага рэгулявання. Дзяржава перастала падтрымліваць адносна нізкія цэны на асноўныя прадукты, спажывецкія тавары і паслугі, ліквідаваліся многія ранейшыя льготы для розных колаў насельніцтва. Гэтыя рэформы, вядомыя пад назвай «шокавай тэрапіі», прывялі першапачаткова да высокага ўзроўню беспрацоўя, росту цэн. Рынак напоўніўся таварамі народнага спажывання, аднак значная частка насельніцтва не магла іх набыць, бо мела нізкія даходы. Хутчэй і з меншымі складанасцямі пачалі выходзіць з крызісу краіны, дзе пераўтварэнні былі падрыхтаваныя рэформамі, праведзенымі яшчэ да падзення сацыялістычных рэжымаў (Венгрыя, Польшча, Чэхія). Тут ужо ў сярэдзіне 1990-х гг. пачаўся значны эканамічны рост.

**Краіны ЦПУЕ ў другой палове 1990-х гг. — пачатку XXI ст.**

Складанасці пераходу да капіталізму выклікалі незадаволенасць значнай часткі насельніцтва палітычнымі сіламі, якія праводзілі рэформы, абумовілі рост уплыву левых партый сацыял-дэмакратычнай накіраванасці. У выніку выбараў у сярэдзіне 1990-х гг. сацыялісты прыйшлі да ўлады ў Балгарыі, Венгрыі, Польшчы. У цэлым яны працягнулі рэформы, скіраваныя на пабудову рыначнай эканомікі, але імкнуліся аказаць падтрымку сацыяльным колам, чый узровень жыцця ва ўмовах пераходнага перыяду быў нізкі.

Напачатку XXI ст. краіны ЦПУЕ скончылі перабудову сваёй эканомікі на рыначныя рэйкі, дасягнулі росту вытворчасці. Сусветны фінансавы і эканамічны крызіс 2008 г. прыпыніў эканамічны рост большасці краін рэгіёну (выключэнне — Польшча). Асабліва цяжкі ён быў у Венгрыі і Румыніі. Каб

пераадолець крызіс, краінам ЦПУЕ спатрэбілася некалькі гадоў.

### Распад Чэхаславакіі і Югаславіі

Пераход ад сацыялізму да капіталізму суправаджаўся распадам шматнацыянальных дзяржаў Чэхаславакіі і Югаславіі. У першым выпадку падзел на Чэхію і Славакію 1 студзеня 1993 г. адбыўся мірным шляхам. Распад Югаславіі суправаджаўся шэрагам буйных ваенных канфліктаў. Пасля ўвядзення шматпартыйнай сістэмы на выбарах у югаслаўскіх рэспубліках перамагалі нацыяналістычныя партыі. У выніку ў 1991–1992 гг. нацыянальны суверэнітэт абвясцілі Харватыя, Славенія, Македонія, Боснія і Герцагавіна. Югаслаўская федэрацыя распалася. Праваслаўныя Сербія і Чарнагорыя заключылі ў 1992 г. дамову аб стварэнні Саюзнай рэспублікі Югаславія (СРЮ). У гэты ж час пачалася вайна ў Босніі і Герцагавіне паміж сербскімі, харвацкімі і мусульманскімі фарміраваннямі, у якую былі ўцягнутыя Харватыя і СРЮ. У баснійскім канфлікце 1992–1995 гг. заходнія краіны занялі антысербскую пазіцыю. У 1998 г. палыхнулі ваенныя дзеянні паміж сербамі і албанцамі ў сербскім краі Косава, г. зн. на тэрыторыі самой Югаславіі. Албанскія сепаратысты ставілі сваёй канцавой мэтай здабыццё незалежнасці краю, які з'яўляўся гістарычным цэнтрам Сербіі. Падчас канфлікту ўвесну 1999 г. войскі НАТА ажыццявілі беспрэцэдэнтную ў гісторыі пасляваеннай Еўропы бамбардзіроўку Белграда, Косава і іншых раёнаў СРЮ. У выніку Сербія страціла кантроль над Косавам. У 2006 г. распалася СРЮ. Сербія і Чарнагорыя зрабіліся цалкам незалежнымі.

### Знешняя палітыка

У знешняй палітыцы былыя сацыялістычныя краіны ўзялі курс на інтэграцыю ў структуры Захаду. Першыя ў НАТА былі прынятыя ў 1999 г. Польшча, Чэхія і Венгрыя. Пасля ўступлення ў 2020 г. Паўночнай Македоніі за межамі блока сярод краін ЦПУЕ засталіся толькі Сербія і Боснія і Герцагавіна. Большасць былых сацыялістычных краін сталі членамі ЕС.

*Пасля Другой сусветнай вайны краіны Цэнтральнай і Паўднёва-Усхоняй Еўропы апынуліся ў сферы савецкага ўплыву і пачалі будаваць савецкую мадэль сацыялізму. Дасягнуўшы пэўных поспехаў у сацыяльна-эканамічным развіцці, краіны ЦПУЕ аказаліся не ў стане пераадолець крызісныя з'явы, якія прывялі да «аксамітных рэвалюцый».*

| **калі ў свеце…** | **на тэрыторыі Беларусі…** |
|---|---|
| 1993 г. — падзел Чэхаславакіі | 1991 г. — распад СССР |

**ПЫТАННІ І ЗАДАННІ**

1. Вызначце асноўныя этапы развіцця краін ЦПУЕ. Дайце ім кароткую характарыстыку.
2. Якія пераўтварэнні былі праведзеныя ў краінах ЦПУЕ ў 1945–1947 гг.?
3. Растлумачце значэнне паняцця «савецкая мадэль сацыялізму». Чаму ў краінах ЦПУЕ рэалізоўвалася савецкая мадэль сацыялізму?
4. Вызначце ўнутраныя і знешнія фактары краху сацыялізму ў краінах ЦПУЕ.
5. Чаму эканамічныя рэформы першай паловы 1990-х гг. атрымалі назву «шокавая тэрапія»? У чым сутнасць гэтых рэформаў?